Аляксандр ГОРНЫ

# ДА ПЫТАННЯ АБ КЛАСІФІКАЦЫІ беларускіх палітычных арганізацый у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд

*У 2019 годзе спаўняецца 80 год з часу ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Гэтая знакавая падзея беларускай гісторыі яшчэ раз звяртае ўвагу даследчыкаў на малавывучаныя аспекты гісторыі Заходняй Беларусі і актуалізуе навуковы дыскурс аб новых метадалагічных падыходах у вывучэнні яе праблематыкі. Важнай часткай гісторыі Заходняй Беларусі застаецца беларускі нацыянальны рух, які ў міжваенны перыяд развіўся ў значную палітычную і грамадскую сілу.*

Гісторыя беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, на першы погляд, дастаткова распрацаваная. Фактычна за 80 гадоў як у беларускай, так і ў замежнай гістарыяграфіі назапашаны значны факталагічны матэрыял, а ў навуковы зварот уведзены шматлікія дакументы і матэрыялы. Многія беларускія палітычныя і культурныя арганізацыі Заходняй Беларусі (напрыклад, Беларускі пасольскі клуб, пасольскі клуб "Змаганне", Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры і інш.) атрымалі грунтоўнае асвятленне ў працах даследчыкаў на сучасным этапе развіцця гістарычнай думкі Беларусі. Тым не менш метаўзровень даследавання гісторыі беларускага нацыянальнага руху застаўся незакранутым нават у сучасных абагульняючых даследаваннях. Метадалагічныя падмуркі і тэарэтычныя аспекты праблемы наўпрост ігнараваліся многімі даследчыкамі, што прывяло да сур'ёзнай лакуны ў комплексным падыходзе да вывучэння беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. Таму тэарэтычная база даследаванняў з'яўляецца дастаткова сціплай, і ў першую чаргу ў ёй адсутнічае грунтоўна распрацаваная класіфікацыя беларускіх палітычных арганізацый Заходняй Беларусі.

Першыя спробы класіфікацыі беларускага палітычнага і культурнага поля рабіліся непасрэдна ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд некаторымі аналітыкамі і публіцыстамі. Безумоўна, на распрацоўку класіфікацыі значна паўплывалі палітычныя погляды таго ці іншага аўтара, а галоўным крытэрыем вызначэння палітычнай сілы выступаў геапалітычны фактар. Так, публіцыст газеты "Сялянская ніва" пад псеўданімам А.Незалежнік (магчыма, беларускі дзеяч А.Більдзюкевіч) у 1927 г. прапанаваў дзяліць беларускія газеты, што выходзілі на той час у Заходняй Беларусі, на тры накірункі. Да першага, "заходняга", ці "паланафільскага", накірунку адносіліся газеты "Беларускі дзень" і "Беларускае слова" з выразнай праўрадавай ідэалогіяй. "Усходні", ці "саветафільскі", накірунак прадстаўляла газета "Наша праўда", вакол якой аб'ядноўваліся былыя дзеячы Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). Абодва гэтыя накірункі А.Незалежнік лічыў "нявольніцкімі" і супрацьпастаўляў ім трэці, "незалежніцкі", які рэпрэзентавала ўласна "Сялянская ніва"[1]. Безумоўна, гэтае вызначэнне было пэўным ідэалагічным штампам, звязаным з вострай канкурэнтнай барацьбой розных палітычных сіл Заходняй Беларусі паміж сабой.

У 1930 г. невядомы аўтар газеты "Беларускі кліч", якая выдавалася непасрэдна перад выбарамі ў польскі парламент, прапанаваў вылучыць у беларускім палітычным жыцці Заходняй Беларусі тры накірункі:



***ГОРНЫ Аляксандр Сяргеевіч.***

*Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1988 г. у Гродна. У 2011 г. закончыў факультэт гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Янкі Купалы, у 2015 г. — аспірантуру. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.)". Даследуе гісторыю беларускага нацыянальнага руху ў XX стагоддзі, гісторыю беларускай дыяспары, гісторыю праваслаўнай царквы ў XX стагоддзі. Аўтар каля 50 навуковых і навукова-папулярных публікацый.*



pawet.net

камуністычны, паланафільскі і незалежніцкі. Галоўным крытэрыем у іх вызначэнні з’яўлялася палітычная арыентацыя той ці іншай арганізацыі і іх адносіны да пытання незалежнасці Беларусі. Таму невыпадкова, што першыя два накірункі лічыліся аўтарам артыкула штучнымі, створанымі зверху "небеларускімі" палітычнымі сіламі, а найбольшая ўвага надавалася незалежніцкаму накірунку (да яго адносіліся такія арганізацыі, як Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС) і Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб’яднанне (ПБДА). У адрозненне ад іншых, менавіта гэты накірунак, на думку публіцыста, быў звязаны з ранейшымі традыцыямі беларускага нацыянальнага руху і лічыўся найбольш перспектыўным для палітычнай будучыні Беларусі. Дадзеныя вызначэнні, тым не менш, не былі пазбаўленыя факталагічных хібаў, напрыклад, гісторыю камуністычнага накірунку аўтар памылкова адлічваў ад часу ўтварэння БСРГ[2]. Аднак шмат у чым гэтая класіфікацыя дастаткова добра адлюстравала асаблівасці беларускага палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі, і яе можна прыняць за аснову ў распрацоўцы больш навуковай класіфікацыі, адпаведна, удакладніўшы і пашырыўшы крытэрыі адбору.

Арыгінальную класіфікацыю беларускага палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі прапанавалі ў канцы 1930-х гг. публіцысты віленскай газеты "Беларускі фронт". Яны падзялілі ўсё беларускае насельніцтва на чатыры групы паводле палітычных арыентацый. Да першай групы адносіліся т. зв. "русафілы", альбо камуністы, — людзі з яскрава вызначанымі прарасійскімі поглядамі, якія падтрымліваюць камунізм, не столькі з ідэйных, колькі з геапалітычных прычын. Другая група — "кар’ерысты", якія спрабуюць прыстасавацца да польскай палітычнай сістэмы і знайсці там свой сацыяльны ліфт. Трэцюю групу складалі свядомыя беларусы, удзельнікі беларускіх палітычных і культурных арганізацый розных накірункаў. Да апошняй, чацвёртай групы адносілася ўсё астатняе беларускае насельніцтва, якое мала цікавілася палітыкай і не прымала актыўнага ўдзелу ў нацыянальным руху[3]. Як бачна, дадзеная класіфікацыя адлюстроўвала не столькі ўвесь палітычны спектр беларускіх арганізацый, колькі рабіла націск на ацэнках удзельнікаў палітычнага жыцця і іх ангажаванасці ў нацыянальны рух. Ігнараванне арганізацыйнага фактару тут было звязана з тым, што ў канцы 1930-х гг. з-за польскіх рэпрэсій у Заходняй Беларусі засталося мала дзеяздольных беларускіх палітычных арганізацый.

Савецкая гістарычная навука таксама рабіла спробу вызначыць пэўныя накірункі грамадска-палітычнага жыцця беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі. Крытэрыем вызначэння служыў, безумоўна, марксісцкі падыход, які панаваў на той час у навуковым дыскурсе. У адпаведнасці з ім, кожная заходнебеларуская палітычная структура разглядалася праз прызму сацыяльнага складу яе членаў, адносінаў да сацыялістычнага ладу і Савецкага Саюза ў цэлым. Важным фактарам з’яўлялася адпаведнасць гістарыяграфічнаму канону рэвалюцыйнай барацьбы як галоўнаму сродку сацыяльнага вызвалення Заходняй Беларусі. У 1962 г. беларускія гісторыкі І.Палуян і У.Палуян сфармулявалі ідэю аб існаванні двух палітычных лагераў Заходняй Беларусі — лагера рэвалюцыі і лагера рэакцыі. Галоўнай дзеючай сілай рэвалюцыйнага лагеру прызнавалася Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), вакол якой аб’ядноўвалася "прагрэсіўная" частка грамадства, рабочыя і сяляне. Астатнія палітычныя сілы, якія не падзялялі ідэй сацыялістычнага будаўніцтва і рэвалюцыйных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі, адносіліся аўтарамі да рэакцыйнага лагеру і падвяргаліся навуковаму астракізму[4]. У 1978 г. У.Палуян пашырыў гэты падзел, вызначыўшы *"рэвалюцыйны лагер", "рэакцыйны буржуазна-памешчыцкі лагер"* і *"дробнабуржуазна-згодніцкі лагер"*[5]. Тым не менш беларускія савецкія гісторыкі ў сваіх даследаваннях не заўсёды дакладна карысталіся вызначэннямі прыведзеных вышэй канцэпцый, дазвалялі сабе значна спрошчваць тэрміналагічны апарат і ўмоўна падзялялі нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі на два асноўныя накірункі: рэвалюцыйна-дэмакратычны і буржуазна-нацыяналістычны.

Трэба заўважыць, што гэтыя два накірункі акрэслены намі ўмоўна пасля праведзенага аналізу беларускай савецкай гістарыяграфіі, бо ў савецкі перыяд навукова абгрунтаванай класіфікацыі так і не было створана. Таму, прынамсі, за *"буржуазна-нацыяналістычнымі"* арганізацыямі не замацавалася канкрэтнага тэрміну, і яны маглі называцца ў розных працах па-рознаму — *"нацыяналістычны лагер"*, *"беларускія нацыяналісты"*, *"беларускія буржуазныя нацыяналісты"* і г. д., а побач з азначэннем *"рэвалюцыйна-дэмакратычны рух"* часам маглі выкарыстоўвацца словазлучэнне *"левыя сілы"*[6]. Аднак не заўсёды гэтыя вызначэнні мелі адпаведнае сэнсавае напаўненне. Напрыклад, беларускіх эсэраў, якія крытычна ставіліся да камуністаў, савецкія гісторыкі адносілі да *"буржуазных нацыяналістаў"*, нягледзячы на тое, што тыя прытрымліваліся левай ідэалогіі і рэвалюцыйных поглядаў[7]. Вельмі часта ў *"нацыяналістычны лагер"* запісваліся супрацьлеглыя па сваім палітычным і ідэалагічным накірунку сілы, напрыклад, беларускія хрысціянскія дэмакраты, паланафілы, нацыянал-сацыялісты, якія да таго ж канкуравалі паміж сабой. Ігнараванне савецкімі гісторыкамі дадзенага фактару і метадалагічны канфармізм значна звужалі навуковае асэнсаванне беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі і часта прыводзілі да памылковых высноў.

У пачатку 1990-х гг., калі гістарычная навука ў Беларусі пазбавілася ідэалагічнага ціску, тэматыка

гісторыі Заходняй Беларусі набыла новую перспектыву даследаванняў і выклікала сапраўдны навуковы ўсплёск. Аднак у той час, калі ў навуковы зварот уводзіліся раней невядомыя дакументы, многія метадалагічныя і канцэптуальныя падыходы засталіся на старым узроўні і патрабавалі значнай перапрацоўкі з улікам новых навуковых рэалій. Напрыклад, у 1993 г. гісторык У.Ладысеў вызначыў два напрамкі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі: рэвалюцыйна-вызваленчы, да якога адносіў КПЗБ, БСРГ і пасольскі клуб "Змаганне", і культурна-асветніцкі (БХД, віленскі БНК, група Луцкевіча-Астроўскага)[8]. Фактычна даследчык паўтарыў стары савецкі падзел палітычных арганізацый Заходняй Беларусі на рэвалюцыйна-дэмакратычныя і буржуазна-нацыяналістычныя, касметычна замяніўшы назву апошняга накірунку на "культурна-асветніцкі" адпаведна новым гістарычным падыходам. Як і ў выпадку з савецкай класіфікацыяй, падобнае дзяленне не ўлічвала ўсёй паўнаты і асаблівасцяў палітычных праграм розных беларускіх арганізацый у Заходняй Беларусі. У прыватнасці, БХД і група Луцкевіча-Астроўскага не толькі займаліся культурнай дзейнасцю, але і надавалі значную ўвагу палітычнаму жыццю.

Водгаласы старой савецкай класіфікацыі сустракаюцца ў раздзеле пра Заходнюю Беларусь у міжваенны перыяд у пятым томе шасцітомнага выдання "Гісторыя Беларусі". Аўтары, аналізуючы палітычнае жыццё Заходняй Беларусі ў цэлым, вылучылі тры асноўныя сацыяльна-палітычныя лагеры — буржуазна-памешчыцкі ўрадавы лагер, дробнабуржуазны дэмакратычны і рэвалюцыйна-дэмакратычны. Такія беларускія арганізацыі, як БХД, група Луцкевіча-Астроўскага, адносіліся аўтарамі тома да дробнабуржуазнага дэмакратычнага лагеру, а КПЗБ і БСРГ, як і ў савецкай гістарыяграфіі, лічыліся рэвалюцыйна-дэмакратычнымі сіламі[9]. Фактычна ў дадзеным выпадку быў выкарыстаны стары паняційны апарат з вялікім уплывам марксісцкага падыходу, не напоўнены новым навуковым сэнсам. У далейшых выданнях, прысвечаных гісторыі Заходняй Беларусі, аўтарскія калектывы ўжо імкнуліся пазбягаць такога запазычання, хаця новых класіфікацый так і не было прапанавана для навуковай апрабацыі.

Пэўныя спробы прааналізаваць беларускае палітычнае жыццё ў міжваеннай Польшчы з дапамогай падзелу на шэраг плыняў рабілі прадстаўнікі замежнай гістарыяграфіі. У кнізе "Уздым і заняпад беларускага нацыяналізму 1906—1931 гг." шведскі гісторык Пэр Андрэс Рудлінг пры аналізе палітычнага становішча Заходняй Беларусі вылучыў два палітычныя накірункі беларускага нацыянальнага руху, існаванне якіх цесна звязаў з геапалітычным фактарам. *"Некамуністычныя нацыянальныя сілы"*, да якіх адносіліся БХД і урад БНР у эміграцыі, паводле Р.А.Рудлінга, арыентаваліся ў сваёй дзейнасці на ковенскую Літву, а "левыя сілы" — на Маскву і Мінск[10]. Нягледзячы на тое, што дадзены падзел звужаў увесь спектр беларускіх палітычных сіл у міжваеннай Польшчы, была звернута ўвага на значную ролю геапалітычных чыннікаў пры распрацоўцы навуковай класіфікацыі беларускага нацыянальнага руху.

Геапалітычны складнік прысутнічае і ў класіфікацыі, якую прапанавала польская даследчыца К.Гамулка. Яна падзяліла беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі на тры плыні — савецкая, незалежніцкая і прапольская, вызначыўшы ў якасці крытэрыя знешнепалітычныя арыенціры беларускіх палітычных арганізацый[11]. Падобную класіфікацыю, як бачна вышэй, прапаноўвалі заходнебеларускія публіцысты ў міжваенны перыяд. К.Гамулка таксама паспрабавала даць кароткае тлумачэнне кожнай плыні. Прапольская (паланафільская) плынь, на яе думку, ахоплівала тыя беларускія арганізацыі, якія імкнуліся да ўтрымання добрых кантактаў з польскімі ўладамі нават коштам адмовы ад пастулату незалежнасці Беларусі. Прадстаўнікі незалежніцкай плыні стаялі на глебе *"пабудовы беларускай дзяржаўнасці"*. Савецкая плынь ахоплівала партыі, якія выступалі за далучэнне Заходняй Беларусі да БССР. Аднак, як бачна, класіфікацыя Гамулкі не ўтрымлівала канкрэтных прыкладаў той ці іншай плыні, а некаторыя іх характарыстыкі былі дастаткова размытымі і патрабавалі значнага ўдакладнення, звязанага перадусім з палітычна-ідэалагічнай сутнасцю кожнай плыні.

Для некаторых прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі было характэрна спрошчванне беларускага палітычнага жыцця ў міжваеннай Польшчы і звядзенне яго да некалькіх замкнёных накірункаў. Так, польскі гісторык Я.Ягусь падкрэсліваў, што сярод заходніх беларусаў у міжваенны перыяд істотнае значэнне адыгрывалі толькі два палітычныя накірункі — камуністычны і хрысціянска-дэмакратычны[12].

Неабходна заўважыць, што трохступеньчаты падзел беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, які быў характэрны для класіфікацый заходнебеларускіх публіцыстаў 1920—1930-х гг. і К.Гамулкі, найбольш дакладна адлюстроўвае тагачасную рэчаіснасць беларускага палітычнага жыцця міжваеннай Польшчы. Менавіта такі падыход быў узяты за аснову для распрацоўкі класіфікацыі, якая прапаноўваецца аўтарам гэтай публікацыі. Дадзеная класіфікацыя была распрацаваная на аснове аналізу палітычных праграм розных беларускіх арганізацый Заходняй Беларусі і гістарыяграфічных здабыткаў, абапіраецца як на ідэалагічныя ўстаноўкі, так і на погляды той ці іншай арганізацыі на далейшае дзяржаўнае ўладкаванне беларускіх земляў з улікам знешнепалітычнага фактару.

У адпаведнасці з вышэйадзначанымі крытэрыямі беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд можна падзяліць на тры плыні: *нацыянальна-дэмакратычная (незалежніцкая), ле-*

*варадыкальная, паланафільская*. Вызначым асаблівасці кожнай з гэтых плыняў.

Да **нацыянальна-дэмакратычнай (незалежніцкай) плыні** можна аднесці такія беларускія палітычныя структуры Заходняй Беларусі, як БХД, БСС, віленскі Беларускі нацыянальны камітэт (з 1927 г.), групу В.Гадлеўскага "Беларускі фронт", Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (ПБДА). Асаблівасцю гэтай плыні было тое, што ўсе гэтыя арганізацыі дамагаліся аб'яднання беларускіх земляў і стварэння незалежнай беларускай дзяржавы па ўзоры еўрапейскіх дзяржаў з рэспубліканскай формай кіравання. У прыватнасці, у праграме БХД 1926 г. падкрэслівалася імкненне да стварэння незалежнай дэмакратычнай рэспублікі на ўсіх аб'яднаных землях беларускага народа[13]. Увогуле, узорам палітычнай праграмы гэтая плынь лічыла III Устаўную грамату БНР ад 25 сакавіка 1918 г., а дату абвяшчэння незалежнасці БНР імкнулася мемарыялізаваць у свядомасці беларускага насельніцтва міжваеннай Польшчы з дапамогай штогадовых урачыстых святкаванняў[14].

Важнай рысай нацыянальна-дэмакратычнай плыні была адмова ад рэвалюцыйных метадаў барацьбы. Яе прадстаўнікі не прызнавалі класавай тэорыі і марксісцкіх поглядаў на грамадства і імкнуліся ажыццяўляць сваю дзейнасць парламенцкімі, эвалюцыйнымі і арганізацыйна-выхаваўчымі сродкамі. Большасць арганізацый гэтай плыні знаходзілася пад уплывам палітычнай дактрыны хрысціянскай дэмакратыі і адмаўляла гвалтоўны шлях барацьбы за незалежнасць. Асноўны націск рабіўся на ідэю эвалюцыйнага прагрэсу і т. зв. *"пазітыўную беларускую працу"*, якая прадугледжвала выхаваўчую дзейнасць па пашырэнні нацыянальнай свядомасці сярод беларусаў[15]. Таму амаль ва ўсіх праграмах прыведзеных вышэй арганізацый прапісвалася ажыццяўленне праграмных мэтаў *"дарогай арганізавання, усведамлення і ўзгадвання"* беларускага насельніцтва. Таксама ў праграмы арганізацый былі закладзеныя патрабаванні шырокіх дэмакратычных свабод, абарона прыватнай уласнасці і незалежнасці судовай сістэмы. Прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнай плыні не адмаўляліся ад удзелу ў парламенцкіх выбарчых кампаніях і выбарах у мясцовыя органы самакіравання міжваеннай Польшчы[16].

Да правага флангу нацыянальна-дэмакратычнай плыні можна аднесці Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю, якая ўтварылася ў Заходняй Беларусі ў 1936 г. на чале з Ф.Акінчыцам. Беларускія нацыянал-сацыялісты, капіруючы шмат у чым палітычную праграму нямецкага нацызму, выступалі за стварэнне незалежнай беларускай рэспублікі, аднак дастаткова крытычна адносіліся да развіцця дэмакратычных інстытутаў, капіталізму ў сельскай гаспадарцы, што лічылі *"пустаслоўным дактрынёрствам"*[17].

**Левaрадыкальная плынь** з'яўлялася адной з масавых і добра арганізаваных плыняў беларускага палітычнага жыцця ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Яна сумяшчала як легальныя, так і нелегальныя формы палітычнай барацьбы. Да яе адносіліся такія палітычныя структуры, як Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР), Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), КПЗБ, беларускі пасольскі клуб "Змаганне", БСРГ.

Галоўным вызначальным атрыбутам дадзенай плыні з'яўлялася жаданне змяніць грамадскі і эканамічны лад радыкальнымі, ці рэвалюцыйнымі сродкамі. Пры гэтым кожная з вышэйадзначаных арганізацый мела розныя грамадска-палітычныя левардыкальныя ўстаноўкі, не заўсёды звязаныя з класічным марксізмам ці савецкім ленінізмам. У прыватнасці, праграма БПСР з'яўлялася пэўным сімбіёзам марксізму, анархізму і левага народніцтва, накіраванага ў першую чаргу на сялянскае насельніцтва. Эсэры прызнавалі рэвалюцыйную барацьбу галоўным шляхам дасягнення сваіх мэтаў, планавалі арганізаваць грамадскае жыццё з дапамогай працоўных саветаў і правесці сацыялізацыю зямлі[18]. КПЗБ, наадварот, цалкам прыняла праграму польскіх камуністаў, якая адпавядала палітычным канонам Камінтэрна: арганізацыя пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы, усталяванне дыктатуры пралетарыяту, правядзенне радыкальных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы і прамысловасці па савецкім узоры[19]. Праграмныя дакументы БСРГ і пасольскага клуба "Змаганне" хоць і не ўтрымлівалі прамыя заклікі да рэвалюцыйнай барацьбы дзеля захоўвання легальнасці, аднак змяшчалі шэраг радыкальных пунктаў, у прыватнасці канфіскацыю абшарніцкіх земляў, утварэнне сялянска-работніцкага ўраду, барацьбу супраць прывілеяў абшарнікаў і буржуазіі, што дазваляе адносіць гэтыя арганізацыі да левардыкальнай плыні[20]. Клуб "Змаганне" ў публічным дыскурсе выкарыстоўваў фактычна тую ж палітычную рыторыку, што і заходнебеларускія камуністы[21].

Розным было стаўленне левых радыкалаў да будучыні заходнебеларускіх земляў, менавіта таму нельга гэты накірунак палітычнай думкі вызначаць выключна як саветафільскі. Беларускія эсэры разглядалі Беларусь як незалежную рэспубліку ў этнаграфічных межах на чале з працоўнымі саветамі, якая ў будучыні можа ўвайсці ў склад *"сусветнай федэрацыі свабодных народаў"*[22]. Прадстаўнікі БРА, КПЗБ і клуба "Змаганне" выступалі за самавызначэнне Заходняй Беларусі і яе далучэнне да БССР, што адпаведна падкрэслівала іх знешнепалітычную арыентацыю[23]. Спецыфічнымі былі погляды на беларускую дзяржаўнасць у БСРГ, якія ў шмат чым былі ўзятыя з эсэраўскай праграмы. Грамада дамагалася стварэння незалежнай рэспублікі *"пад уладаю сялян і работнікаў"*, якая ў будучыні магла стаць часткай *"сацыялістычнага саюза еўрапейскіх народаў"*[24]. Не выключана, аднак,

што многія сябры БСРГ, якія мелі пракамуністычныя погляды, разглядалі гэты пункт праграмы як пэўны тактычны крок для легальнай палітычнай дзейнасці, разумеючы будучыню Заходняй Беларусі выключна ў рамках СССР[25].

Нягледзячы на вышэйадзначаныя адрозненні, заходнебеларускія левaрадыкалы мелі адну агульную характэрную рысу — у сваіх праграмных пастулатах і дзейнасці яны спрабавалі сумяшчаць інтэрнацыянальную рыторыку з моцным нацыянальным кампанентам. Гэтая акалічнасць не была ўласцівая класічнаму левaрадыкальнаму руху, які цалкам адмаўляўся ад значэння нацыяналізму як важнай складовай часткі палітычнага і грамадскага жыцця. Практычна ўсе беларускія левaрадыкальныя арганізацыі ў Заходняй Беларусі ўдзельнічалі ў пашырэнні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і разам з гэтым імкнуліся палепшыць сацыяльнае становішча бедных. Шведскі гісторык Пэр Рудлінг падкрэсліваў, што т. зв. *"левы нацыяналізм"* дамінаваў у беларускім палітычным жыцці Заходняй Беларусі, але не быў беларускім феноменам, падобныя аналагі сустракаліся сярод польскага, літоўскага ці яўрэйскага левaрадыкальнага рухаў[26].

Прадстаўнікі **паланафільскай плыні** беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі адстойвалі ідэю супрацоўніцтва з інстытутамі польскай дзяржавы дзеля дасягнення нацыянальна-культурных і палітычных саступак для беларускага народа, нават за кошт адмовы ад ідэі незалежнасці Беларусі, што было адлюстравана ў іх праграмных дакументах. Многія дзеячы, якія падзялялі такія ідэалагічныя ўстаноўкі, прама называлі сябе "паланафіламі", а свае арганізацыі — паланафільскімі, што было зафіксавана ў гістарычнай літаратуры і дакументальных крыніцах[27]. Да паланафільскіх можна аднесці наступныя беларускія палітычныя структуры ў міжваеннай Польшчы: Краёвая сувязь, Арганізацыя беларускіх беспартыйных актывістаў, Цэнтральны камітэт па беларускіх справах, Часовая беларуская рада (з 1926 г. — Беларуская нацыянальная рада), Беларуская радыкальная народная партыя Ф.Умястоўскага, група Луцкевіча-Астроўскага (т. зв. "беларуская санацыя")[28].

Паланафільская плынь не мела значнай падтрымкі ў асяроддзі беларусаў, была дастаткова слаба арганізаваная з палітычнага пункту гледжання і значна залежала ад польскіх дзяржаўных структур, асабліва ў фінансавым плане. Гэта дало падставы некаторым даследчыкам не вызначаць беларускае паланафільства як асобную плынь грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі. Напрыклад, беларускі гісторык А.Чарнякевіч не разглядае паланафільства як асобны накірунак, а падкрэслівае яго вузкапалітычны характар, карыстаючыся паняццем "паланафільскі асяродак", куды ўключае усяго некалькі асобаў[29]. Тым не менш, на наш погляд, паланафільскую плынь можна лічыць асобнай з'явай палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, бо паланафілы мелі распрацаваныя праграмныя ўстаноўкі, аказвалі ідэалагічны ўплыў на насельніцтва праз прэсу і іншыя агітацыйныя матэрыялы, стварaлі свае зоны ўплыву не толькі ў Вільні, але і ў заходнебеларускай правінцыі. У прыватнасці, падчас парламенцкіх выбараў у Польшчы ў 1928 г. за спіс беларускіх паланафілаў прагаласавала больш за 1000 чалавек[30].

У разуменні будучыні беларускіх земляў беларускія паланафілы прытрымліваліся пазіцыі магчымай аўтаноміі ў складзе Польшчы, а некаторыя арганізацыі, як, напрыклад, Краёвая сувязь ці Часовая беларуская рада, заклікалі да вызвалення Усходняй Беларусі ад бальшавікоў і далучэння яе да польскай дзяржавы[31]. Актыўна ідэя тэрытарыяльнай аўтаноміі Заходняй Беларусі абмяркоўвалася ў 1930-я гг. Напрыклад, прадстаўнікі т. зв. "беларускай санацыі" заклікалі кандыдатаў у дэпутаты польскага парламента дамагацца заканадаўчага акта аб *"шырокай аўтаноміі на беларускіх землях"*[32]. Менавіта выказвалася ідэя вылучэння тэрыторыі з большасцю беларускага насельніцтва (Віленскага, Навагрудскага, Палескага і часткі Беластоцкага ваяводстваў) у асобную адміністрацыйную адзінку польскай дзяржавы і прадастаўлення ёй аўтаноміі[33]. Калі дамаганні аўтаноміі на той перыяд былі фактычна бесперспектыўнымі, то жаданне аб'яднаць заходнебеларускія ваяводствы ў 1930-х гг. мела пад сабой рэальную глебу. Так, у 1930 г. Кадыфікацыйная камісія Польшчы распрацавала праект злучэння тэрыторый Віленскага, Навагрудскага і часткі Беластоцкага ваяводстваў у адно ваяводства. Ён быў пазітыўна ацэнены прадстаўнікамі "беларускай санацыі", аднак яго далейшая рэалізацыя па невядомых прычынах была адкладзеная[34].

Аднак прадстаўнікі паланафільскай плыні не былі аднароднымі ў адносінах да польскіх уладаў. Калі такія арганізацыі, як Краёвая сувязь, Арганізацыя беларускіх беспартыйных актывістаў, Цэнтральны камітэт па беларускіх справах, Часовая беларуская рада лаяльна ставіліся да існуючых польскіх урадавых інстытутаў, то група Луцкевіча-Астроўскага ("беларуская санацыя") разглядалася хутчэй як *"канструктыўная апазіцыя"* да польскіх уладаў. Так, віленскія ваяводскія ўлады адзначалі, што група Луцкевіча-Астроўскага мела пэўны недавер да польскай палітыкі ў "беларускім пытанні", але адначасова не жадала зрываць супрацоўніцтва з ўрадавымі структурамі. На іх думку, разрыў узаемаадносін з уладамі і адсутнасць падтрымкі з іншага боку маглі прывесці да канчатковага заняпаду групы[35].

Такім чынам, беларускія палітычныя арганізацыі ў міжваеннай Заходняй Беларусі можна падзяліць на тры асобныя плыні — нацыянальна-дэмакратычная (незалежніцкая), левaрадыкальная, паланафільская. Кожная з гэтых плыняў мела асаблівасці сваёй

палітычнай праграмы, ідэалагічных установак, знешнепалітычнай арыентацыі і разумення геапалітычнай будучыні беларускіх земляў. Дадзеная класіфікацыя, аднак, не з'яўляецца канчатковым варыянтам падзелу беларускіх палітычных арганізацый і, безумоўна, патрабуе навуковага абмеркавання і магчымага ўдакладнення. У прыватнасці, цяжка вызначыць, да якой палітычнай плыні можна аднесці Беларускі пасольскі клуб у польскім парламенце, які складаўся з людзей розных палітычных поглядаў, прынамсі ў пачатку сваёй дзейнасці. Невывучаным з'яўляецца пытанне трацкісцкіх груп у КПЗБ і іх стаўлення да "беларускага пытання". Гэтыя і іншыя пытанні трэба ўрэгуляваць з улікам сучасных падыходаў і метадаў, варта распрацаваць найбольш поўную класіфікацыю беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі.

[1] Незалежнік А. Нявольніцкая псыхалёгія // Сялянская ніва. 1927. № 68. С. 1.

[2] Try palityčnyja kirunki // Biełaruski klič. 1930. Nr 2. S. 1—2.

[3] Вашкевіч А. Група "Беларускі фронт" і "...змаганьне з чужацкімі фронтамі" // Białoruskie zeszyty historyczne. T. 26. 2006. S. 82.

[4] Полуян В.А., Полуян И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920—1939 гг. Минск, 1962. С. 6—8.

[5] Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.). Минск, 1978. С. 41.

[6] Гл., напр.: Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.). С. 94—96, 123; Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы. Минск, 1988. С. 149.

[7] Ладысеў У. Шлях да свабоды: з гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919—1939 гг. Мінск, 1978. С. 35—36.

[8] Ладысеў У.Ф. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі: метадалагічныя і тэарэтычныя аспекты // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў "Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь" (новыя канцэпцыі і падыходы). Ч. 1. Мінск, 1993. С. 187—188.

[9] Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Мінск, 2007. С. 379.

[10] Rudling P. The rise and fall of belarusian nationalism 1906—1931. Pittsburgh, 2014. P. 166.

[11] Gomółka K. Białoruskie partie i organizacje prorządowe w II Rzeczypospolitej // Białoruskie Zeszyty Historyczne. T. 7. 1997. S. 63.

[12] Jaguś J. Ludność białoruska województwa nowogródzkiego II Rzeczypospolitej w percepcji polskich elit regionu. Toruń, 2014. S. 63.

[13] Вашкевіч А. Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграмаў (1917—1939) // Спадчына. 2006. № 1. С. 31.

[14] Чарнякевіч А., Вашкевіч А. 25 сакавіка: вытокі нацыянальнага свята // Arche. 2008. № 3. С. 62—85.

[15] Вашкевіч А. Група "Беларускі фронт" і "...змаганьне з чужацкімі фронтамі". С. 83; Пагарэлы А. Да праблемы выбару эвалюцыйнай парадыгмы сацыяльных змен Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыяй міжваеннага перыяду // Białoruskie zeszyty historyczne. T. 50. 2018. S. 108.

[16] Вашкевіч А. Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграмаў (1917—1939). С. 31, 33; З арганізацыйнага жыцьця Беларуск. Сялянскага Саюзу // Сялянская ніва. 1926. № 11. С. 2; Праваслаўна-Беларускае Дэмократычнае Аб'еднаньне (праграма) // Праваслаўная Беларусь. 1927. № 3. С. 3.

[17] Нашыя тэзы // Новы шлях. 1934. № 2. С. 1—2; Праграма Беларускай Нацыянал-Сацыялістычнай Партыі // Новы шлях. 1936. № 1. С. 1—5.

[18] Программа Белорусской партии социалистов-революционеров // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч.II. У истоков политического противостояния. Гомель, 1993. С. 25—31.

[19] Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.). Минск, 1966. С. 69.

[20] Палітычная плятформа Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады // Бюлетэнь Соймавага Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады. 1926. № 9. С. 1; Даніловіч В. Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.). Мінск, 2007. С. 29.

[21] Місарэвіч Я., Каралёў М. І.С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. Гродна, 1995. С. 84—88.

[22] Программа Белорусской партии социалистов-революционеров. С. 27; Грыб Т. Выбранае. Мінск, 2017. С. 22.

[23] Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.). С. 69.

[24] Палітычная плятформа Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады. С. 1.

[25] Кароткі нарыс беларускага пытаньня. Мінск, 2009. С. 245.

[26] Rudling P. The rise and fall of belarusian nationalism 1906-1931. P. 189—190.

[27] Савіч А.А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921—1939 гады): гістарыяграфія праблемы. Брэст, 2012. С. 185—187; Pawlukiewicz A. List otwarty do społeczeństwa polskiego // Słowo. 1925. Nr 200. S. 2; Lietuvos centrinis valstybės archyvas (далей — LCVA). F. 129, ap. 2, b. 415, l. 19 v.

[28] Гл. падр.: Горны А. Беларускія паланафільскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд // Беларускі гістарычны часопіс. 2015. № 4. С. 26—33.

[29] Чарнякевіч А. Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 — пачатак 1927 г. // Гістарычны альманах. Т. 12. 2006. С. 78.

[30] Mniejszości narodowe w wyborach do Sejmu i Senatu w r. 1928. Warszawa, 1928. S. 284.

[31] Стэнаграма З'езду Заходняй Беларусі // Раніца. 1921. № 1. С. 2—3.

[32] Наказ Галоўнай Рады Цэнтральнага Саюзу Беларускіх Культурна-Асьветных і Гаспадарскіх Арганізацыяў і Інстытуцыяў кандыдатам на паслоў у Сойм і Сэнат // Народны звон. 1930. № 1. С. 1—2.

[33] Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917—1939 гг.). Мінск, 2003. С. 298.

[34] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 242п, воп. 1, спр. 30, арк. 60.

[35] LCVA. F. 53, ap. 23, b. 1075, l. 26 — 26 v.